● СЕСІЯ

# «ЦІХА! ІДЗЕ ЭКЗАМЕН!»

Такі надпіс часта можна ўбачыць на дзвярах аўдыторый нашага ўніверсітэта на пачатку студзеня. І гэта невыпадкова: на ўсіх факультэтах пачаліся экзаменацыйныя іспыты. Для кагосьці сёлетняя зімовая сесія чарговая, а для кагосьці – першая ў жыцці.

Зразумела, першакурснікі хвалююцца. Паспрабуй вывучыць усе білеты, выспацца перад экзаменам, у бадзёрым настроі прыйсці ва ўніверсітэт і ўпэўнена адказаць на ўсе пытанні... Задача не з простых. А калі яшчэ і экзамен складаны?! Як, напрыклад, у студэнтаў 11-й групы факультэта матэматыкі і інфармацыйных тэхналогій: у першы дзень зімовай сесіі яны здавалі «Матэматычны аналіз». Іспыт прымала патрабавальны, але справядлівы выкладчык – дацэнт кафедры геаметрыі і матэматычнага аналізу Жанна Віктараўна Іванова.

«Мы атрымалі па "шасцёрцы", – расказваюць першакурснікі Павел Бірук і Мікіта Гапонаў. – Улічваючы тое, што здавалі мы экзамен па складанай дысцыпліне, то, мяркуем, гэта неблагая адзнака. Канешне, хваляваліся: усё ж такі першы экзамен ва ўніверсітэце. Рыхтаваліся адказна, бо спадзяваліся не на халяву і шчаслівы білет, а на ўласныя веды».

Студэнты 14-й групы гэтага ж факультэта здавалі экзамен «Бяспечнасць жыццядзейнасці чалавека», што прымаў старшы выкладчык кафедры анатоміі і фізіялогіі Аляксандр Мікалаевіч Дудараў. Дысцыпліна цікавая і, безумоўна, карысная, а хлопцы і дзяўчаты добра падрыхтаваліся да іспыту.

«Будучыя праграмісты заўсёды грунтоўна рыхтуюцца да сесіі, – адзначае Аляксандр Мікалаевіч. – Студэнты 11-й групы даволі моцныя. Адсюль і вынік: сярэдні бал па экзамене – 8,5».

Спадзяёмся, што і астатнія іспыты матэматыкі вытрымаюць годна.













Фота Н. ЛАЗЕБНАЙ.

Каля аўдыторыі, дзе праходзіў экзамен па альгалогіі і мікалогіі (экзаменатар – дацэнт кафедры батанікі Павел Юр'евіч Калмакоў), было шматлюдна і весела. Хтосьці гартаў канспект, хтосьці чытаў падручнік. Адчувалася, што студэнты былі ўпэўненыя ў сваіх ведах і з нецярпеннем чакалі чаргі, каб зайсці ў аўдыторыю.

«Экзамену мы не баімся, – гаворыць студэнтка 14-й групы Аляксандра Кавалёва, – бо наведвалі ўсе заняткі, адказвалі на практычных, сур'езна рыхтаваліся да іспыту. Да таго ж Павел Юр'евіч заўсёды ў даступнай і крэатыўнай форме нам выкладаў дысцыпліну, дзякуючы чаму інфармацыя лёгка запаміналася».

Належным чынам падрыхтаваліся да экзамену і іншыя першакурсніцы: Анастасія Гаўрыльчык, Святлана Леснікова, Уладзіслава Крыўко і Анастасія Карповіч. Дома яны праштудзіравалі кожнае экзаменацыйнае пытанне і на іспыт прыйшлі ўпэўненыя ў сваіх ведах.

Атмасфера на экзамене ў П.Ю. Калмакова была добразычлівай. Вопытны выкладчык ведаў, як паставіцца да студэнтаў, якія здавалі экзамен упершыню: калі трэба было падбадзёрыць, калі – усміхнуцца, калі – задаць дадатковае пытанне, каб студэнты не разгубіліся, а прадэманстравалі свае веды. Дзякуючы такому падыходу і вынік атрымаўся добры: большасць хлопцаў і дзяўчат здала іспыт на «васьмёркі» і «дзявяткі».

«Кожны выкладчык павінен быць яшчэ і псіхолагам, – зазначае Павел Юр'евіч. – Першакурснікам і так складана, таму самае галоўнае – іх не запалохаць. Бо ад таго, як пройдуць першы экзамен і першая сесія, надалей залежаць настрой і жаданне студэнтаў добра вучыцца».

**Аляксандра АЛЯКСАНДРАВА.**

**На здымках:** студэнты біялагічнага факультэта і факультэта матэматыкі і інфармацыйных тэхналогій.